Дзяржаўная установа адукацыі
«Заслаўская сярэдняя школа №2 імя М.К. Пуцейкі»

# Турнір знаўцаў роднай мовы
# “Таямніцы роднай мовы”

Падрыхтавала:
Аршанская Т.Ч.,
настаўнік беларускай мовы і
літаратуры

Заслаўе, 2023

Турнір знаўцаў роднай мовы
"Таямніцы роднай мовы"

Мэта: фарміраванне маўленчай культуры вучняў, выхаванне пачуцця гонару за мову беларускага народа, паважлівых адносін да яе.

Задачы: - стварыць умовы для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў;
- садзейнічаць выхаванню грамадзянкасці, пачуцця патрыятызму;
- фарміраваць уменне працаваць у камандзе.

Ход мерапрыемства

Вядучы 1: (Пад музыку)
Адчыніце дзверы, людцы,
Адусюль хай далятае:
Словы родныя куюцца
Кросны родныя снуюцца
Песні родныя пяюцца
Мова,
Мова
Нас вітае.
Вольга Куртаніч

Вядучы 2
Роднае слова – люстэрка культуры народа, яго духоўнае аблічча. Мова – наша спадчына, якую мы атрымліваем ад бацькоў і павінны перадаць наступным пакаленням. Хто хоць раз пачуў беларускую мову, не забудзе яе мяккасці і мілагучнасці, плаўнасці і напеўнасці, сціплай прыгажосці і самабытнасці.

Вядучы 1:
Сардэчна вітаем! Сёння мы здзейснім падарожжа ў чароўны і прыгожы свет беларускай мовы.

Вядучы 2:
Па прапанове Бангладэш пад эгідай ЮНЕСКА з 1999 года 21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны тыдзень роднай мовы. Менавіта ў гэты дзень ( 21 лютага 1952 г.) загінулі пяць студэнтаў у Бангладэш, якія абаранялі свае правы вучыцца на роднай мове.

Вядучы 1:
Сёння на планеце Зямля жыве больш за 300 народаў, якія размаўляюць не менш чым на 2796 мовах. Славянскія мовы - пятая па распаўсюджванні на планеце група моў. Нядаўна налічвалася 7-8 тыс.жывых моў, цяпер - каля 6 тыс., некаторыя знаходзяцца на мяжы знікнення. Кожная чацвёртая мова мае менш за тысячу носьбітаў, а на 46 размаўляе ўсяго па адным чалавеку.

Вядучы 2:
Мовай, што знікае прынята лічыць тую, якую вывучае менш за 70 % дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту. А гібель мовы адбываецца па той прычыне , што яна раствараецца сярод іншых культур, народаў або пры поўным

выміранні народа. І калі знікне мова, то знікне і народ, знікне памяць, культура, здабыткі продкаў. Вось таму мова - спосаб прадаўжэння нашага існавання, передача вопыту будучаму пакаленню , гэта знак прысутнасці чалавека на Зямлі.

Вядучы 1:

Беларуская мова - адна з развітых і багатых моў свету. З некаторымі яе асаблівасцямі акурат і пазнаёмімся ў час нашай гульні.

Вядучы 2:

Запрашаем Трошка Уладзіміра, які прачытае нам верш "Калі ласка".

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: "Калі ласка!.."
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
– Калі ласка, калі ласка, ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка бліснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!
Хлопец кажа дарагой дзячыне:
– Калі ласка! Будзеш гаспадыняй!..
Эх, жыццё збудуем мы прыгожа,
Ўсе з табой нягоды пераможам.
Гром грыміць. З нябёсамі размова:
– Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
І не вельмі буйны і не рэдкі –
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады, на кветкі...
– Калі ласка! – наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу:
– Калі ласка, сонца, выйдзі з хмары,
Радасцю аблашчы нашы твары,
Ты ўзнімі з сабою нашы мары!
– Калі ласка!.. – нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.

Вядучы 1:

Дзякуй вялікі! Аўтар гэтых задушэўных слоў – паэт Пятрусь Броўка. У іх выказана бязмерная любоў да роднай мовы. Наша задача – берагчы мову, вывучаць, пашыраць сферу яе бытавання. Сёння мы правядзём турнір, прысвечаны Тыдню беларускай мовы і літаратуры, які выявіць лепшых знаўцаў беларускай мовы. Гуляюць 2 каманды па 5 чалавек. Ацэньваць іх адказы будзе

журы.:_________________________________________________________________
_
Вядучы 2:
А пачнём мы нашу гульню з таго, што кожная каманда прыдумае назву і выберыць сабе капітана. Пару хвілін вам на абмеркаванне. (*Праз 1-2 хвіліны агучваюцца вынікі)*
Вядучы 1: Першы конкурс “Размінка”
За кожны правільны адказ каманда атрымлівае адзін бал. Калі здагадаліся ці хочаце даць адказ, то падымайце руку.А журы ўважліва будзе сачыць за адказамі. *(Вядучыя задаюць пытанні па чарзе.)*
Вядучы 2:
Назавіце словы, у якіх 100 зычных (стол, стог, стоп, стос).
Вядучы 1:
Чым канчаецца тыдзень? (мяккім знакам)
Вядучы 2:
Ёсць у азёрах і рэках, а ў акіянах няма; ёсць у дрэвах і травах, а ў кветках няма? (літары Р).
Вядучы 1:
Якую частку слова заўсёды знойдзеш у зямлі? (корань)
Вядучы 2:
Якому славутаму друкару паставілі помнік у Нясвіжы? (Сымону Буднаму)
Вядучы 1:
Якой літары беларускага алфавіта ўстаноўлены помнік у Полацку ?( Ў)
Вядучы 2:
Назавіце пятае лішняе: Нёман, Вілія, Прыпяць, Свіцязь, Сож (Свіцязь –возера).
Вядучы 1:
У назвах якіх беларускіх гарадоў адна галосная літара? (Клецк, Брэст, Шклоў, Слуцк, Пінск…)
Вядучы 2:
Які беларускі горад называецца так, як і летні месяц? (Чэрвень)
Вядучы 1:
У якога беларускага пісьменніка псеўданімам з’яўляецца назва колеру? (К.Чорны)
Вядучы 2:
Другі конкурс “Перакладчыкі”. Неабходна падабраць беларускія адпаведнікі да рускіх слоў і запісаць іх у табліцу. За кожны правільны адказ 2 балы . *(Раздаць заданні)*
Пуговица, юбка, платье, рубашка, носки, шляпа, воротник, брюки, варежки, карман.
Вядучы 1: Трэці конкурс “Фразеалагізмы”
Прапануем для капітанаў каманд наступнае заданне. Неабходна з дадзеных частак скласці фразеалагізмы – устойлівыя спалучэнні слоў, якія вобразна характарызуюць з’яву, чалавечы характар: *(Раздаць заданні)*

*Намыліць грамата насіць не вядзе*
*З галавой абое біць зямлі*
*На руках і вухам шыю рабое*
*Лынды пуп кітайская выдаць*
Вядучы 2:
Пакуль капітаны выконваюць заданне, мы падрыхтавалі для вас, паважаныя госці, "Загадкі з вясёлай хаткі".
*По чарзе зачытваюцца загадкі вядучымі.*

1. Касматы, вусаты, есці пачынае – песенькі спявае. (Кот)
2. Вось вам быль-нібыліца: у пяці чалавек – адна паясніца. (Рука і пальцы)
3. Пер'я наелася, у кашулю адзелася, спіць у ахвоту начная істота, ляжыць, дзе і ты, чатыры рукі і два жываты. (Падушка)
4. Што бяжыць без повада? (Вада)
5. Што нас корміць, а есці не просіць? (Зямля)
6. Каляровае карамысла цераз рэчку павісла. (Вяселка)
7. Не агонь, а пячэцца? (Крапіва)
8. Хто ні ідзе, усяк яму паклоніцца? (Грыб, ягада)
9.Па небу каціцца катушка, ні звер, ні птушка, ні пясок, ні вада, а адгадаць – бяда?(Сонца).
10.Гаршочак разумны, хоць і сем дзірак мае. (Галава)
11.У печы парыцца ў вопратцы, да стала ідзе распранутаю. (Бульба)
12. У жываце – лазня, у носе – рэшата, на галаве – пупок, адна рука, і тая на спіне.(Чайнік)
13. Паміж гуркамі, буракамі – каза з зяленымі рагамі. (Цыбуля)
14. Крутаста, вяртаста, на ёй адзежы за сто, хто распранае, той пражыве лет за сто.(Капуста).
15. Круглае, гарбатае, вакол махнатае, як прыйдзе бяда, пацячэ і вада. (Вока)
Вядучы 2:
Чацвёрты конкурс “Расшыфруй прыказку”. Праверым, наколькі добра вы ведаеце беларускі алфавіт. Каб разгадаць зашыфраванае выказванне, трэба суаднесці лічбу і літару алфавіта. Хто не толькі правільна, але і хутка разгадае запіс – атрымае 5 балаў.
21, 19, 33, 14, 21 17, 1, 25, 1, 20, 1, 12 – 18, 16, 5, 15, 1, 33 14, 16, 3, 1.

*Фізкультхвілінка . Прагляд мультфільма "Свінка Пэпа"на беларускай мове.*

Вядучы 1:
Пяты конкурс “Музей народнага побыту”. Прапаную наведаць віртуальны музей. На малюнках прадстаўлены прадметы народнага побыту. Камандам па чарзе неабходна назваць гэтыя прадметы, даць ім азначэнне ці патлумачыць, для чаго яны ўжываюцца.

Прадметы: кросны, куфар, прас, збан, серп, ручнік.
Кросны – хатні ткацкі станок.
Куфар – скрыня з векам на завесах і замком, якая служыць для захоўвання

адзежы і інш.
Прас – прылада для адгладжвання бялізны і адзення.
Збан – высокая гліняная пасудзіна, выцягнутая і звужаная зверху, з ручкай.
Серп – ручная прылада ў выглядзе паўкруглага дробна назубленага нажа для жніва.
Ручнік – вузкая доўгая паласа кужэльнай (з лёну) ці баваўнянай тканіны, прызначаная для выцірання цела, посуду.

Вядучы 1:
Паважанае журы, агучце, калі ласка вынікі гульні.
(Агучванне вынікаў).
Вядучы 2:
Паважаныя слухачы запомніце 10 запаведзяў аб мове *Віктара Шведа:*
Вядучы 1
Мову родную беражы.
Вядучы 2
Мовай роднаю даражы.
Вядучы 1
Мову родную шануй.
Вядучы 2
Мовай роднай не гандлюй.
Вядучы 1
Мову родную любі.
Вядучы 2
Мовы роднай не кідай.
Вядучы 1
Мову дзецям перадай.
Вядучы 2
Мовы не аддай на здзек.
Вядучы 1
Толькі з ёю жыцця век.
Вядучы 2:

Дзякуй вялікі за ўвагу! Да новых сустрэч!








vyshivkaukr.livemaster.ru



